



# КРЫЖОВЫ ШЛЯХ НА СВЯТУЮ ГАРУ

**У ашмянскіх католікаў перадвялікодны тыдзень заўсёды пачынаецца з крыжовай дарогі да Галгофы (так называецца месца на Святой гары — самым высокім геадэзічным пункце ў Ашмянах). У пальмовую (вербную) нядзелю ад касцёла да гары нясуць чатырохметровы драўляны крыж. Яго падымаюць і кладуць сабе на плечы дванаццаць мужчын, нясуць два кіламетры. Святочная працэсія робіць чатырнаццаць прыпынкаў на «стацыях» — часовых і ўпрыгожаных алтарах, — менавіта столькі разоў Хрыстос спыняўся на сваім цярністым шляху да Галгофы. За час дарогі крыж нельга апускаць на зямлю і толькі на Святой гары яго апускаюць і ўсталёўваюць побач з іншымі — мінулагоднімі крыжамі. У гэтую нядзелю ўстаноўлены дваццаць трэці па ліку крыж, а гэта азначае, што менавіта столькі гадоў працягваецца гэтая традыцыя, сэнс якой — адчуць пакуты Хрыста ў яго апошніх днях зямнога жыцця.**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*г. Ашмяны.*







**Творчая група:** макетаванне — Анатоль Кляшчук, Іван Хвір; мастацкі рэдактар — Аляксандр Асіпенка; вёрстка — Вікторыя Міpончык.

Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».